Паводле Л. Галамбёўскага, з часоў Аўгуста III, калі паўстала мода высылаць дзяцей буйной шляхты за мяжу для набыцця полеру, моладзь, вяртаючыся з падарожжа і атрымліваючы бацькоўскія двары, радыкальна пачала іх перабудоўваць [2, s. 9]. Часам маладыя гаспадары выбудоўвалі двор на новым месцы, а стары двор прызначаўся для службаў, станавіўся «фальварковым», у яго пераязджаў эканом, рабілася дворская кухня і чалядня [1, s. 328, 357]. Не рэдкасцю бывалі выпадкі, калі нашчадкі вядомых родаў прадавалі свае радзінныя гнёзды разам з фамільнымі склепамі сваіх продкаў, як здарылася, напрыклад, з Хойнікамі Прозараў, якія былі прададзеныя ў 1889 годзе Канстанцінам Прозарам расійскаму купцу [1, s. 343]. Большасць шляхецкіх драўляных двароў, з тых, што не паддаліся пажарам, у канцы XVIII стагоддзя былі перабудаваны «з-за маніі наватарства», як піша У. Лазінскі. Па гэтай прычыне на пачатку XX стагоддзя можна было знайсці толькі лічаныя прыклады драўляных двароў канца XVII стагоддзя – XVIII ст., значна большая іх доля адносілася да першай паловы XIX ст. [8, s. 56]. Паводле П. Баброўскага, большая частка панскіх палацаў, якіх асабліва было многа ў заходняй Беларусі, у сярэдзіне 60-ых гадоў XIX стагоддзя знаходзілася ў заняпадзе, часта пакінутая сваімі гаспадарамі [10, с. 159].

Панскі двор на беларускіх землях як архітэктурны і гаспадарчы комплекс развіваўся паступова, не маючы завершанай цэласнасці і стылістычнай аднастайнасці. У забудове драўляных двароў небагатай шляхты можна было сустрэць спробы наследавання вялікапанскім мураваным палацам. Напрыклад, пэўныя элементы стылю барока (ламаны дах) сустракаліся ў драўляных пабудовах XVIII стагоддзя. Большасць шляхецкіх двароў XVIII – пачатку XIX стагоддзя былі вытрыманыя ў лаканічным стылю класіцызму [1, s. 280–298]. Пры выбары месца пад будаўніцтва дваранскай сядзібы, яе архітэктурна-планіровачнага рашэння, землеўладальнікі кіраваліся комплексам эстэтычных, санітарна-экалагічных, гаспадарчых уяўленняў аб ідэальным панскім двары. У залежнасці ад асноўнай функцыянальнай прыналежнасці сядзібы (статусна-рэпрэзентатыўнай, рэкрэацыйнай або гаспадарчай) прыярытэты пры выбары месца маглі адрозніваца. Аднак у большасці выпадкаў дваранская сядзіба заставалася той «маленькай радзімай», дзе праходзіла значная частка жыцця памешчыка. Гэта было месца сацыяльнага і культурнага ўзнаўлення памешчыцкага саслоўя, полем пераважнай эканамічнай дзейнасці і грамадска-палітычнай актыўнасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Gloger, Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce : w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa : Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 1. – 1907. – 383 s.
2. Gołębiowski, Ł. Domy i dwory / Ł. Gołębiowski. – Warszawa : Druk. N. Gkücksberga, 1830. – 296 c.
3. Gloger, Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce : w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa : Druk Wl. Lazarskiego, 1907–1909. – T. 2. – 1909. – 192 s.
4. Лакотка, А.І. Пад стрэхамі прашчураў / А.І. Лакотка. – Мінск : Полымя, 1995. – 384 с.
5. Tyszkiewicz, K. Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym / K. Tyszkiewicz. – Drezno : drukiem i nakładem Józefa I. Kraszewskiego, 1871. – XVI. – 362 s.
6. Dybowski, T. Gospodarstwo postepowe w Litwie / T. Dybowski. – Wilno : Druk. J. Zawadzkiego, 1850. – 146 s.
7. Massalski, E.T. Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy : romans administracijny : w 5 cz. / E.T. Massalski. – Wilno : W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. – Cz. 2. – 268 s.
8. Łoziński, W. Życie polskie w dawnych wiekach / W. Łoziński. – 4 wyd. – Lwów : H. Altenberg – Gubrynowicz & Syn, 1921. – VII. – 261 s.
9. Шыдлоўскі, С.А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі : 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 168 с.
10. Бобровский, П.О. Физические и нравственные элементы северо-западных губерний России / П.О. Бобровский // Вестн. Западной России. – Вильно. – 1865. – Г. III. – Кн. XII. – Ч. 3. – С. 157–172.


**УДК 72.025.4 + 72.04.03(692.8)(476)**

## ХАРАКТЭРНЫЯ ПРЫЁМЫ ЗАПАЎНЕННЯ І АЗДАБЛЕННЯ ДЗВЯРНЫХ І ВАКОННЫХ ПРАЁМАЎ У САКРАЛЬНАЙ АРХІТЭКТУРЫ ПАДЗВІННЯ

***Ю.Т. ШЭСТАК***
***(Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск)***

*Прадстаўлены вынікі даследвання шэрагу аб'ектаў сакральнай архітэктуры Падзвіння, якое было праведзена з мэтай выяўлення адметных архітэктурных рысаў ваконнага і дзвярнога запаўнення і аздаблення. На падставе аналізу сабраных матэрыялаў праводзіцца разгляд асобных спецыфічных узораў і агульных тэндэнцый, характэрных для рэгіёна.*

Як вядома, дзверы і вокны – гэта дэталі ў дойлідстве, прызначэнне якіх, аднак, выходзіць за межы функцыі дэкаратыўнага сродка архітэктурнай выразнасці. Безумоўна, вонкавы выгляд любога будынка, залежыць, у тым ліку і ад сталярных вырабаў, Але, акрамя таго, апошнія тлумачаць прасторава-функцыянальную арганізацыю і прызначэнне пабудовы ў цэлым. Дзверы і вокны не толькі мусяць быць абаронай ад неспрыяльных умоваў надвор’я і злачынцаў, але і паказваюць статус і род дзейнасці ўласніка, што з’яўляецца вельмі істотным фактарам менавіта ў сакральнай архітэктуры і натуральным чынам адлюстроўваецца ў канструкцыйных і асабліва архітэктурна-мастацкіх рашэннях. Таксама важна адзначыць, што дзвярныя і ваконныя запаўненні з’яўляюцца атрыбутам, які кожны рэгіён у доўгатэрміновым працэсе змены эпох развіваў згодна агульным тэндэнцыям, але ў дэталях па-свойму, часам вельмі індывідуальна – што адлюстроўвала мастацкую традыцыю края, эканамічныя ўмовы, узровень тэхнічнага майстэрства, даступнасць таго ці іншага матэрыялу. Канструкцыя і дэкаратыўнае аздабленне дзвярэй і вокнаў пастаянна ўдасканальваліся. Таму сярод шматлікіх архітэктурных дэталяў, якія развіваліся на працягу стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі, сталярныя вырабы маюць ледзь ні найбольшую разнастайнасць вырашэнняў.

Дзвярныя ў ваконныя запаўненні падзяляюць найперш паводле размяшчэння і прызначэння на вонкавыя, унутраныя, балконавыя, ляжачыя, парадныя і чорныя (службовыя). У сакральнай архітэктуры прадстаўлены ўсе гэтыя тыпы. Асобна варта згадаць, што ў храмах часта сустракаюцца ляжачыя дзверы над уваходам у крыпту. Напрыклад, дзверы ў інтэр’еры касцёла Св. Іаанна Хрысціцеля (1603–1600 гг.) у в. Камаі Пастаўскага раёна.

Наступны крытэрый падзелу сталярных вырабаў – характарыстыкі галоўных элементаў: матэрыял, лік створак, спосаб адкрывання, канструктыўныя вырашэнні, дэкаратыўнае аздабленне, наяўнасць скабяных вырабаў. Большасць дзвярэй была драўлянаю з металічнымі скабянымі элементамі. Цалкам з жалеза звычайна рабіліся дзверы, якія вялі ў крыпту. Але не толькі: напрыклад, дзверы сененскага манастыра францысканцаў (не захаваліся да нашага часу). Паводле складнікаў палатна на Падзвінні найчасцей сустракаюцца глухія дзверы: цалкам з дрэва ці метала. Таксама бываюць часткова зашклёныя, з продухамі, з фрамугай (капліца Хамянтоўскіх у маёнтку Халяпіна, XIX ст., в. Рэучча, Талачынскі раён), з зашкленнем верхніх філёнгаў (касцёл Божага Цела ў в. Іказнь Браслаўскага раёна). Згодна наяўнасці створак самым распаўсюджаным тыпам дзвярэй з’яўляецца двухстворкавы з палотнамі роўнымі па габарытах. У касцёле Св. Міхаіла Арханёла (1744 г.) у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна можна ўбачыць дзверы з форткай. Абсалютная большасць дзвярэй паводле спосабу адкрывання ўяўляе з сябе двухстворкавыя распашныя дзверы. Як напрыклад, у глыбоцкім касцёле Унебаўзяцця Панны Марыі (1735 г.).

Вокны паводле матэрыялу рамы найчасцей сустракаюцца драўляныя (напрыклад, ва ўніяцкай царкве ў в. Кавалі, пач. XIX ст.; у браслаўскім касцёле і г.д.). Таксама бываюць рамы металічныя, цагляныя, каменныя, змешаныя. Вельмі цікавы ўзор вакна з металічнымі пераплётамі знаходзіцца ў касцёле ў Опсе (пач. XX ст.): тут у арыгінальную валавяную раму ўстаўлена новае вітражнае шкло. На галоўным фасадзе неагатычнага касцёла ў Слабодцы (1903 г.) Браслаўскага раёна можна ўбачыць вакно-ружу з прафіляванай рамай, адлітай з бетону (мал. 1). Вытанчаныя цагляныя рамы Успенскай царквы ў в. Сар’я (1858 г.) Верхнядзвінскага раёна разам з стромкімі вежамі выкрываюць арыгінальную прыналежнасць храма да каталіцкай будаўнічай традыцыі. На фасадах лепельскага касцёла Св. Казіміра (1857–1876 гг.) можна ўбачыць змешаны тып: вокны з двух розных матэрыялаў. Вельмі цікавы прыклад храма з драўлянымі ваканіцамі ўяўляе з сябе асвейская Царква Святога Георгія (XIX ст.) ў Верхнядзвінскім раёне.



**Малюнак 1 – Акно-ружа на галоўным фасадзе касцёла Сэрца Ісуса ў в. Слабодка Браслаўскага раёна**

PolotskSU

Шырока распаўсюджаны дзвярныя і ваконныя скабяныя вырабы: ручкі, клямкі, петлі і завесы, замкі, шпінгалеты, цвікі і г.д. У асноўным, яны галоўным чынам выконваюць сваю першасную ўтылітарную функцыю, але сустракаюцца і вельмі дэкаратыўна распрацаваныя ўзоры, як напрыклад, у касцёле ў Слабодцы, дзе і галоўныя і бакавыя дзверы грунтоўна аздоблены з дапамогаю раскаваных завесаў і іншых скабяных вырабаў (мал. 2).

Паводле канструктыўнага тыпу дзверы могуць быць з дошак або філянговымі. У першым выпадку спосаб злучэння дошак вызначае канструкцыйны варыянт рашэння: дошкава-брусковы (царква ў в. Замошша, 1893 г., Браслаўскі раён), дошкава-брусковы з дыяганальным клямарам (касцёл у в. Дунілавічы Пастаўскага раёна), падвоены з двух пластоў дошак (касцёл у Ваўкалаце, пач. XX ст., Докшыцкі раён), дошкава-шпонкавы (царква Св. Георгія ў в. Перабродздзе, Міёрскі раён) (мал. 3). Трэба адзначыць, што архаічнага тыпу дошкавых дзвярэй на бегунах (пятках) у сакральнай архітэктуры Падзвіння, верагодна, не захавалася, што звязана з знакавай функцыяй храмавага ўваходу.



**Малюнак 2 – Касцёл у в. Слабодка Браслаўскага раёна. Ручка, завеса**



**Малюнак 3 – Царква Св. Георгія, в. Перабродздзе Мёрскага раёна. Архіў Я. Балзункевіча**

Філянговыя дзверы – другі асноўны канструктыўны тып драўляных дзвярэй – шырока распаўсюджваецца на тэрыторыі Беларусі з др. пал. XIX ст. і мае мноства прыкладаў у сакральнай архітэктуры Падзвіння. Гэта адна-, двух-, трохфілянговыя і нават многафілянговыя дзверы (як напрыклад, на ўваходзе ў касцёл Св. Троіцы ў Глыбокім (1764–1782 гг.)).

Непаўторнасць, адметнасць (у тым ліку і рэгіянальная) сталярных вырабаў ствараецца ўва многім за кошт накладзенага на канструкцыю звонку разнастайнага дэкора. Часта на адным палатне выкарыстоўваецца некалькі тыпаў аздаблення. Тут побач з выразнымі стылявымі рашэннямі могуць сустракацца апрацаванні "styleless", "па-за стылем". Некаторыя элементы аздобы вельмі працяглы перыяд выконваліся ў прынятай і звыклай форме, і менавіта таму ў многіх выпадках бывае цяжка вызначыць час стварэння пэўных дзвярэй ці вокнаў [1, с. 273]. Генезіс з канструкцыйных форм традыцыйнай драўлянай архітэктуры доўгі час заставаўся невычарпальнай крыніцай сродкаў архітэктурна-мастацкай выразнасці. Шырокае ўвасабленне ў храмавым дойлідстве Падзвіння знайшлі эклектыка і мадэрн, што адбілася ў сваю чаргу і на дэкоры сталярных вырабаў, перадаўшы ім свае характэрныя рысы. Таксама сакральнае будаўніцтва мае пэўныя спецыфічныя архітэктурныя каноны, што цягне за сабою стварэнне і развіццё адмысловых з'яваў у дэкоры: гэта, напрыклад, крыжы на паверхні дзвярэй, у пераплётах вокнаў і г.д. Такія элементы безумоўна сустракаюцца ў разглядаемым рэгіёне (мал. 4).



**Малюнак 4 – Пакроўская царква, пач. XX ст., в. Асінгарадок. Фрагмент дзвярэй. Фота А.В. Яроменка**

Для дзвярэй з дошак характэрны наступныя ўпрыгожванні: шалёўка (касцёл у в. Малькаўшчына, XVIII ст., Браслаўскі раён ), абшыўка драўлянымі кратаўніцамі (царква кляштара базыльянаў, XVIII ст., Талачын), абабіванне металічнымі элементамі (аверс дзвярэй касцёла Сэрца Іісуса ў в. Слабодка), мастацкае запаўненне фрамугі (храм у в. Каменполле, пачатак XX ст., Міёрскі раён) (мал. 5). Вельмі цікавы ўзор аздаблення знаходзіцца ў касцёле ў Слабодцы, дзе тыльны бок (рэверс) абшыты псеўдафілёнгамі, што дадаткова кажа пра значную ролю гэтага ўваходу ў храм, таму што звычайна так дэкаруецца толькі вонкавы бок. Дзверы касцёла Унебаўзяцця Панны Марыі ў Глыбокім (1735 г.) захавалі да нашага часу незвычайную дэталізаваную разьбу (мал. 6).



**Малюнак 5 – Драўляны храм, пач. XX ст., Мёрскі раён. Архіў С.А. Сергачова**



**Малюнак 6 – Касцёл Унебаўзяцця Панны Марыі ў г. Глыбокае (1735 г.). Фрагмент дзвярэй. Фота: С.А.Сергачоў**

Дзверы з філянговай канструкцыяй маюць свае дэкаратыўныя прыёмы: падзел на панэлі (касцёл Св. Духа, 1853–1864 гг., в. Ула Бешанковіцкага раёна), прафіляванне краёў абвязкі і краёў філёнгі (Успенская царква ў Шаркаўшчыне, 1912 г.), запаўненне асвятляльнага праёма і фрамугі (касцёл Божага Цела ў в. Іказнь, Браслаўскі раён, 1905 г.), імітацыя архітэктанічных формаў (касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі, в. Відзы, Браслаўскі раён, 1909–1914 гг.), разьба (капліца ў Ахрэмаўцах (Бельмонтах), 1858 г., Браслаўскі раён), накладанне гатовых металічных элементаў (Пакроўская царква, пач. XX ст., в.Асінгарадок).

Можна падсумаваць, што ў цэлым эвалюцыя розных тыпаў дзвярных і ваконных запаўненняў на поўначы Беларусі адбывалася адпаведна магістральным мастацкім стылям і тэндэнцыям. Сінтэз восевых і цэнтрычных кампазіцый, рацыянальная, але выразная форма, якой вызначаюцца храмы, перадаюцца ўсім дэталям, у тым ліку ваконнаму і дзвярныму аздабленню. Разам з тым у рэгіёне знаходзіцца шэраг унікальных узораў сталярных вырабаў, кожны з якіх з'яўляецца вартым асобнай увагі і разгляду. Такая сітуацыя склалася дзякуючы шэрагу прычын, галоўнай з якіх застаецца ўласна сакральная функцыя пабудовы ў цэлым, дзеля якой больш увагі надавалі таксама ўваходам, асабліва галоўнаму, і вокнам. Для сталярных працаў ахвяравалася пэўная колькасць грошай, запрашаліся лепшыя майстры, часам замежныя, і такім чынам, гістарычны працэс узаемадзеяння культур у канчатковым выніку забяспечваў развіццё нацыянальных асаблівасцяў [2, с. 7].

У эвалюцыі форм дзвярнога і ваконнага запаўнення і аздаблення ў сакральнай архітэктуры Падзвіння яскрава прасочваецца ўззаемаўплыў сусветных і лакальных будаўнічых культур. Характэрны рацыянальная, але выразная форма канструкцыі і дэкор, з дапамогай якога ствараецца цэлы шэраг узораў сталярных вырабаў, унікальных для краіны ў цэлым.

ЛІТАРАТУРА


1. Tajchman, J. Drewniane drzwi zabytkowe na terenie polski (Systematyka i problematyka konserwatorska) / J. Tajchman // Ochrona zabytków. – 1991. – № 4. – S. 269–277.
2. Лакотка, А.І. Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі / А.І. Лакотка. – Мінск : Беларусь, 2003. – 224 с.


Polotsk